# Уступ для беларускага чытача

Увазе беларускага чытача прапануецца кніга доктара гістарычных навук (doktor habilitowany) Дарыюша Купіша, ад'юнкта факультэту гісторыі XVI—XVIII стст. Люблінскага ўнівэрсытэту імя Марыі Складоўскай-Кюры. У сваёй навуковай дзейнасьці аўтар распрацоўвае праблематыку вайсковай справы і ваенных кампаній Рэчы Паспалітай (полацкай 1579, пскоўскай 1581—1582, смаленскай 1632—1634), рэлігійнай ідэнтычнасьці і генэалёгіі радамскай шляхты, гісторыі разьвіцьця Радама і Малапольшчы.

Кніга «Полацак 1579» ўбачыла сьвет у Польшчы ў 2003 годзе. Пераклад на беларускую мову быў упершыню апублікаваны ў «ARCHE» (№ 4/2009).

Гэтая праца прысьвечана паходу войскаў Вялікага Княства Літоўскага, Польскага каралеўства і наёмнікаў на чале са Стэфанам Баторыем на Полацак і яго вызваленьню з-пад маскоўскай акупацыі ў 1579 г. Праўда, аўтар не абмяжоўваецца толькі гэтай падзеяй, і раскрывае прадгісторыю канфлікту паміж ВКЛ і Маскоўскім княствам за сярэдняе Падзьвіньне, аналізуе склад войска і мабілізацыйныя магчымасьці варагуючых бакоў і, натуральна, ход і вынікі самой кампаніі 1579 г.

З айчынных аўтараў толькі Вітаўт Чаропка ў папулярным стылі асьвятляў гэтыя падзеі, але ў беларускай навуковай літаратуры яна цэласна не разглядалася. Пасобная закранутыя аўтарам сюжэты беларускія гісторыкі пачалі распрацоўваць толькі ў апошні час, але, зноў жа, у нашай краіне пакуль не зьявілася сынтэтычнай манаграфіі, прысьвечанай вызваленьню Полацку С. Баторыем у 1579 г.

Дасьледаваньне, што прапануецца вашай увазе, працягвае і разьвівае традыцыі польскай гістарыяграфіі, адной з найбольш распрацаваных у Цэнтральнай Эўропе. Слабым бокам працы ёсьць кепская знаёмасць яе аўтара з тапанімікай Полаччыны, а таксама беларускімі і расійскімі архіўнымі матэрыяламі. Тым ня менш на падмурку клясычных польскіх дасьледаваньняў вайсковай справы аўтар дае досыць аб'ектыўнае і поўнае адлюстраваньне вайны паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай у 1558—1582 гг., удакладняючы раней дадзеныя трактоўкі самымі апошнімі на момант напісаньня кнігі распрацоўкамі польскай, расійскай і беларускай гістарычнай навукі.

Гэты твор, прысьвечаны адной з найбольш яркіх падзеяў у гісторыі нашай Бацькаўшыны і ўсёй ўсходняй Эўропы XVI ст., бясспрэчна, заслугоўвае ўвагі беларускага чытача.

*Віктар Якубаў, старшы выкладчык Полацкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Дасьледуе пытаньні, зьвязаныя з барацьбой за Інфлянты паміж ВКЛ, Польшчай, Швэцыяй у канцы XVI — пачатку XVII стст.*

## Іншыя кнігі Дарыюша Купіша:

*Аўтарскія манаграфіі*:

Rody szlacheckie ziemi radomskiej. RTN, Radom 2009.

Radom w czasach Jagiellonów 1386 – 1572. RTN, Radom 2009.

Wojska powiatowe samorządów Małopolski i Rusi Czerwonej w latach 1572 – 1717. Wyd. UMCS, Lublin 2008.

Psków 1581 – 1582. Wydawnictwo Bellona, Warszawa 2006.

Połock 1579. Wydawnictwo Bellona, Warszawa 2003.

Smoleńsk 1632 – 1634. Wydawnictwo Bellona, Warszawa 2001.

Zbigniew Gorajski 1596 – 1655. Studium z dziejów szlachty protestanckiej w Małopolsce w pierwszej połowie XVII wieku. Wyd. Naukowe Semper, Warszawa 2000.

Pakosław. Dzieje podiłżeckiej wsi na tle rozwoju regionu od czasów najdawniejszych do 1795 r. RTN, Radom 1998.

*Рэдактарская праца і ўдзел у калектыўных выданьнях*:

Kościół św. Jana Chrzciciela w Radomiu, architektura – ludzie – wydarzenia, red. D. Kupisz, ITEE, Radom 2010.

Wojsko w Radomiu. Od średniowiecza po dzień dzisiejszy. Red. D. Kupisz, RTN, Radom 2008.

Radom jako siedziba urzędów administracji centralnej do 1945 r. Red. D. Kupisz, RTN, Radom 2006.

Z dziejów administracji w Małopolsce w XVI – XX wieku. Red. D. Kupisz, WSH, Radom 2003.

Szkice z dziejów polskiego ruchu spółdzielczego w XX wieku. Red. A. Duszyk, D. Kupisz, WSH, Radom 2004.

W służbie Bogu i społeczeństwu. Zakony na ziemiach polskich w XVI – XIX wieku, red. D. Kupisz, RTN, Radom 2004.

*Найважнейшыя навуковыя артыкулы:*

Działalność gospodarcza starostów radomskich w XVI – XVII wieku w świetle lustracji oraz inwentarzy // «Roczniki Dziejów Społecznych i Gospodarczych», t. 62, 2002.

Gorajscy w XV – XVI w. Studium z dziejów awansu społeczno-politycznego rodziny szlacheckiej // «Almanach Historyczny», t. 3, 2001.

Świadczenia wsi klasztornych na rzecz starostwa radomskiego i ekonomii kozienickiej w XVI – XVIII w. // Kościół katolicki na pograniczu Małopolski i Mazowsza w XV – XVIII w. red. Z. Pietrzyk, Radom 2002.

Młodzież polska na uniwersytetach Europy Zachodniej w XVI wieku. // Idee Humanistyczne renesansu w integracji europejskiej, red. H. Bednarczyk, Radom 2002.

Sycyna. Dzieje podradomskiej wsi do końca XIX wieku. // «Biuletyn Kwartalny Radomskiego Towarzystwa Naukowego», t. 25, 2000.

Urzędnicy i personel grodu radomskiego w XVI wieku. // «Prawo, Administracja, Kościół», t. 13, 2003.